Источник: "Звязда" - 2024-11-15

# «Віцебскі край» збірае радзімазнаўцаў

**21—22 лістапада ў Віцебскай абласной бібліятэцы імя У. І. Леніна пройдзе чарговая, дзясятая па ліку, навукова-практычная канферэнцыя «Віцебскі край». Акрамя бібліятэкі, яе арганізатарамі выступаюць Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і Віцебскі абласны краязнаўчы музей.**

Прадстаўнічы навукова-практычны форум збярэ звыш 100 навукоўцаў, краязнаўцаў, бібліятэкараў, музеязнаўцаў. Канферэнцыі будзе папярэднічаць круглы стол «Вайна — трагедыя і памяць народа: 80 гадоў вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў», які пройдзе на базе Віцебскага абласнога краязнаўчага музея. Мяркуецца разгляд даволі цікавых, арыгінальных тэм, якія праліваюць святло на розныя падзеі Вялікай Айчыннай вайны: «Рэпартаж ваеннага кінадакументаліста Георгія Голубава «Людзі з канцлагера» з франтавога спецвыпуску № 1 за 1944 год «Бітва за Віцебск» (гэтую тэму раскрые Ігар Рымашэўскі з НАН Беларусі); «Дзеянні савецкай авіяцыі далёкага дзеяння па зрыве перагрупіроўкі нямецкіх войск на Полацкім напрамку ў чэрвені-ліпені 1944 г.» (краязнавец Сяргей Капыл); «Вызваленне Мёраў 4 ліпеня 1944 года ў дакументах і ўспамінах відавочцаў» (краязнавец Вітольд Ермалёнак); «Ураджэнцы Віцебскай вобласці ў баях Вялікай Айчыннай вайны: яны прадстаўляліся да звання Героя Савецкага Саюза» (настаўнік Канстанцін Гайдукоў)...

Удзельнікі канферэнцыі выступяць на наступных секцыях: «Гістарычнае краязнаўства. Віцебскі край ад старажытнасці да 1917 г.»; «Гістарычнае краязнаўства. Віцебскі край з 1918 да 1941 г.»; «Гістарычнае краязнаўства. Віцебскі край з 1941 г. да сучаснасці»; «Літаратуразнаўства»; «Краязнаўства ў сістэме гуманітарных навук».

Па выніках чарговай канферэнцыі «Віцебскі край» мяркуецца папоўніць бібліятэку віцебсказнаўчай літаратуры: пабачыць свет выданне зборніка дакладаў і выступленняў. Канферэнцыя з году ў год набывае больш грунтоўнае гучанне як сапраўдная падзея ў гісторыка-краязнаўчым жыцці не толькі Віцебшчыны, але і ўсёй Беларусі.

**Мікола БЕРЛЕЖ.**